Праваабаронцы за свабодныя выбары

(//spring96.org) (http://www.belhelcom.org)



«Што не дазволена, тое забаронена». Ці можна фатаграфаваць бюлетэнь?

21.02.2022



(//spring96.org/files/images/sources/neverau-referendum.jpg)

Аляксей Няверaў

На 27 лютага прызначаны рэферэндум аб прыняцці паправак у Канстытуцыю. Нязручныя пытанні аб правядзенні рэферэндуму журналісты задалі старшыні Гомельскай абласной камісіі па рэферэндуме Аляксею Няверaву.

На маючых адбыцца выбарах выбарчыя камісіі падрыхтавалі адкрытыя кабінкі для галасавання. Такім чынам тое, што будзе рабіць у кабінцы выбаршчык, не будзе з'яўляцца таямніцай для прысутных. У сувязі з гэтым, ці мае права выбаршчык пайсці яшчэ далей і сфатаграфаваць вынік свайго галасавання.

- Падкажыце, калі ласка, фатаграфаваць можна бюлетэні?

- Не. Выбарчым кодэксам ... бюлетэні фатаграфаваць забаронена. Ёсць у нас 13-ы артыкул Выбарчага кодэкса, у якім адзначана, што дазволена назіральніку.

- А што забаронена?

- Што не дазволена, тое забаронена.

- Не назіральніку, а таму хто галасуе?

- Нельга ... Ну вам для чаго яго фатаграфаваць? На памяць? Сфатаграфуйце вось банеры ў гарадах.

Па перакананні старшыні абласной камісіі па рэферэндуме, права на таямніцу галасавання зараз з'яўляецца абавязкам грамадзяніна:

- Я хачу з бюлетэнем сфатаграфавацца. Гэта ж маё права.

- Якое права? Адкрыць ці не адкрыць? У нас жа тайнае галасаванне. Дзе ў вас напісаны правы, што гэта ваша права - адкрыць сваю таямніцу? Я вам задаю пытанне - дзе напісана?

Далей старшыня абласной камісіі Няверaў адмовіўся пракаментаваць затрыманні людзей, якія вылучаліся ў назіральнікі. У прыватнасці, размова йшла пра затрыманне (https://spring96.org/be/news/106840) **Мікалая Сушкова.**

"Праваабаронцы за свабодныя выбары" (https://referendum2022.spring96.org/be)

Dit is interessant +1 Tweet

Паведаміць пра парушэнне:
referendum2022@spring96.org (mailto:referendum2022@spring96.org)

Важныя тэлефоны

Цэнтральная камісія: **+375 17 327-19-03 (tel:+375173271903)**

Генеральная пракуратура: **+375 17 378-55-41 (tel:+375173785541)**

Пракуратура г. Мінска: **+375 17 374-23-53 (tel:+375173742353)**

Карысныя спасылкі

- rec.gov.by (http://rec.gov.by/)
- spring96.org (http://spring96.org/)
- belhelcom.org (http://belhelcom.org/)

28.02.2022

Папярэдняя аналітычная справаздача экспертнай місіі па ацэнцы рэспубліканскага рэферэндуму

27.02.2022

Рэферэндум падчас вайны. Хроніка праваабаронцаў асноўнага дня галасавання

08.02.2022

Аналітычная справаздача аб ацэнцы этапа фарміравання ўчастковых камісій па правядзенні рэферэндуму

E-mail: viasna@spring96.org (mailto:viasna@spring96.org) | Пры выкарыстаньні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая